С введением в строй суперЭВМ производительностью свыше 1 триллиона операций в секунду и объемом памяти жесткого диска 7680 Гбайт Россия вышла на третье место в мире по мощности производимых суперЭВМ, обогнав европейские страны, где лидером является Швейцария, а также Китай, который еще год назад опережал Россию. До 2003 года в России будут вестись работы по созданию суперЭВМ производительностью 5 триллионов операций в секунду.

НОВЫЙ “MERCEDES”

Компания Mercedes официально представила новое, уже пятое по счету поколение полноразмерного роскошного родстера Mercedes SL. Новинка теперь обладает жесткой складной крышей, пятилитровым двигателем V8 и буквально нашпигована различными электронными системами.

ДАЙДЖЕСТ

Королева-мать госпитализирована с анемией

Английская королева-мать.

Английская королева-мать была госпитализирована с диагнозом анемия. Она прошла медицинское обследование из-за легкого сердечного недомогания. Анализы крови, взятые во время обследования, показали нехватку красных кровяных телец. Королева-мать Елизавета приехала в частную клинику имени короля Эдуарда VII в центре Лондона на переливание крови и сама, практически без помощи свиты, поднялась по лестнице.

Личный секретарь королевы-матери утверждает, что повода для волнений нет, и она встретит свой день рождения как обычно. В субботу, 4 августа, ей исполнится 101 год.

“Би-Би-Си Ньюс”.

НАСА отложило запуск экспедиции к Солнцу

Из-за повышенной облачности за несколько минут до намеченного старта был в очередной раз отложен запуск космического аппарата Дженезис. Запуск может быть перенесен на сегодня, пятницу. Целью полета 639-килограммового космического аппарата является доставка на землю частиц так называемого “солнечного ветра”. “Химический и изотопный состав Солнца — это та первооснова, из которой сформировались все планеты солнечной системы”, — говорит научный руководитель проекта профессор Дон Бернетт из Калифорнийского технологического института в Пасадене.

Дженезис после запуска с мыса Канаверал пройдет в течении трех месяцев по кратчайшей траектории путь в 930 000 миль (14 880 000 км) и достигнет точки равновесия солнечного и земного притяжения. В этой точке и будет происходить сбор частиц “солнечного ветра” с помощью дифференцирующих улавливателей, сделанных из разных материалов: золота, сапфира, кремния и алмаза.

“Си-Эн-Эн”.

В Антарктиде появятся автоматы для продажи презервативов

Служба снабжения новозеландской антарктической станции Скотт сообщила о том, что в ближайшее время на станцию, где работает группа ученых и технических специалистов, будут завезены два аппарата по продаже презервативов. Снабженцы объясняют свое решение тем, что аппараты могут понадобиться полярникам в преддверии притока посетителей станции в весенне-летний период. Представитель службы снабжения Кевин Эштон заявил, что автоматы по продаже контрацепции полезны жителям поселка полярников еще и в том смысле, что с их помощью они смогут анонимно покупать презервативы, которые прежде приходилось приобретать в местном магазине. Эштон сообщил, что в течение летних месяцев на базе Скотт побывает не менее 400 посетителей и еще более тысячи человек приедут на соседнюю американскую базу Мак-Мердо.

Джимми Картер пропагандирует демократию жителям Бангладеш

В столицу Бангладеш Дакку прибыл бывший президент США Джимми Картер, которому предстоит выступить в роли политического наблюдателя накануне проведения в этой стране всеобщих парламентских выборов. Картер возглавляет делегацию из семи американских политиков и ученых, представляющих вашингтонский Национальный институт демократии. Картеру предстоят встречи с президентом Бангладеш и главой национальной избирательной комиссии, а также выступления перед местной общественностью.

“Рейтер”.

Под Киевом ликвидирован псевдо-завод

В среду пресс-служба МВД Украины обнародовала информацию о ликвидации крупнейшего в стране завода по производству фальсифицированных вин, расположенного в селе Счастливом под Киевом. Дело это было возбуждено уже несколько месяцев назад.

Под завод были арендованы помещения и предприятие занялось производством вин самых популярных на Украине названий: “Монастырская изба”, “Вечерний звон”, “Исповедь монаха”, “Механжийско”, “Огненный танец”, “Старград”, “Кадарка” и “Медвежья кровь” — фальсификат по 3,5—5 гривен продавался практически на всех рынках Киева. Согласно предварительным анализам, популярный сорт болгарского вина “Монастырская изба” делался на заводе из следующих компонентов: вода, спирт, сок бузины, свеклы и краситель “Карамельный колер”.

Всего в течение работы завод выпустил и реализовал продукцию на сумму более 7 миллионов гривен. В течение одного дня оперативники выявили в различных торговых точках, сняли с реализации и изъяли 165 тысяч бутылок вина на сумму около 700 тысяч гривен.

Латвийские радары будут работать на НАТО

Латвийское правительство одобрило планы Министерства обороны страны на покупку у американского концерна Lockheed Martin трехмерного радара для осуществления контроля за воздушным пространством Латвии. Об этом сообщил министр обороны Латвии Гиртс Валдис Кристовскис.

Предполагается, что этот радар будет сооружен у города Резекне, вблизи латвийско-российской границы. Его мощность позволит обнаруживать все летающие объекты в радиусе 350 километров. Таким образом, рабочая зона радара охватит также часть воздушного пространства России и Беларуси. Данные о происходящем в воздушном пространстве соседних с Латвией государств сможет получать и НАТО, так как Северо-Атлантический альянс уже подключен к “Балтнету”.

РИА “Новости”.

В Японии разрешили клонирование человеческих органов

Совет по биоэтике при правительстве Японии дал согласие на проведение экспериментов, целью которых является искусственное выращивание отдельных органов и тканей человека. Для этих экспериментов будут использоваться “стволовые клетки” эмбрионов, из которых можно будет “вырастить” различные органы взрослого организма. Целью этой программы является выработка теоретической базы для создания “биологических фабрик” по производству “запасных органов” для человека.

Во время проведения экспериментов будут использоваться только искусственно оплодотворенные клетки. Причем все доноры будут давать письменное согласие на использование их генетического материала в опытах.

“Би-Би-Си”.

ЭВРИКА!

Новое лекарство поможет диабетикам и толстякам

Группа ученых из США и Японии разрабатывает принципиально новый подход к лечению сахарного диабета. В экспериментах на мышах установлено, что гормон жировой ткани адипонектин быстро снижает уровень сахара в крови. Медики надеются использовать его для лечения сахарного диабета. На основе адипонектина могут быть созданы и препараты для похудания.

Курильщики, не употребляйте витамин С

Витамин С в больших дозах представляет опасность для здоровья курильщиков. Это связано с тем, что из табака в организм проникает кадмий. В сочетании с ним витамин, который обычно оказывает защитное действие, вызывает образование раковых клеток.

Подтяжка кожи лица продлевает жизнь

Подтяжка кожи лица добавляет женщине десять лет жизни. К такому выводу пришли американские ученые, проанализировавшие продолжительность жизни 250 женщин, сделавших эту операцию в 70-х годах. Медики объясняют такой эффект значительным повышением самооценки, а также вниманием к своему здоровью.

Новые евро опасны для здоровья

Наличные евро, которые вскоре будут введены в обращение в странах ЕС, представляют опасность для здоровья. По словам врачей, содержание никеля в монетах достоинством в одну и две евро недопустимо высоко. У многих людей, особенно кассиров и банковских работников, монеты могут вызвать экзему.

Лазерные принтеры вредны

Работа с лазерным принтером может отрицательно сказаться на здоровье. Эксперты немецкого журнала Oeko Test провели исследование тонеров для принтеров и обнаружили, что некоторые из них выделяют токсичные вещества. Эти соединения могут вызвать кашель, повышение температуры, бронхиальную астму и даже рак.

В мире больше миллиарда толстяков

По оценкам Всемирной организации здравоохранения более миллиарда человек в мире имеют лишний вес. Больше всего тучных людей в США (шестьдесят процентов населения), однако эта проблема актуальна и для развивающихся стран. Глава комитета ВОЗ по борьбе с ожирением призвал медиков всего мира уделять больше внимания решению этой проблемы.

Больным экземой поможет одежда из серебра

Немецкие ученые создали ткань, которая помогает больным экземой. Ионы серебра, добавленные в одежду и постельное белье, уничтожают бактерии, с которыми связано развитие этой кожной болезни. К сожалению, чудодейственная ткань недешева. Например, “серебряная” рубашка стоит 170 долларов.

Погиб во время исследования

Шестилетний мальчик погиб в американской больнице во время проведения магнитно-резонансной томографии — исследования, считающегося практически безопасным для пациентов. На ребенка упал металлический кислородный баллон, который сорвался с места под действием мощного магнитного поля томографа.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

Энцыклапедыя “Народнай волі” Выпуск №20

Мендэле Мойхер-Сфорым

Яўрэйскі Дон Кіхот

Беларуская зямля ў розныя часы дала жыццё прадстаўнікам многіх народаў, якія праславіліся ў той галіне дзейнасці, што лічылі для сябе галоўнай. У шэрагу іх і пачынальнік новай яўрэйскай літаратуры ці, як называюць яго яшчэ, дзядуля яўрэйскай літаратуры Мендэле Мойхер-Сфорым. Радзіма яго — адзін з самых старадаўніх нашых гарадоў Капыль, а на той час глухое мястэчка. Адно з многіх, якія ў трыццатыя гады XIX стагоддзя і пазней шмат у чым былі падобныя. З той хіба розніцай, што ў Капылі жыло шмат яўрэяў.

У 1827 годзе з'явіўся ўказ тагачаснага цара Мікалая І, паводле якога і яўрэяў пачалі браць у рэкруты, што дагэтуль у дачыненні да яўрэйскага насельніцтва не практыкавалася. Ды і яўрэі вялікай ахвоты не праяўлялі. Старэйшына капыльскага кагала рэб Хаімка знайшоў выйсце, якім карысталіся і ў іншых населеных пунктах. Шукалі наймітаў (калі-нікалі гэтым займаліся і самі члены кагала), якія лавілі на дарогах бедных яўрэяў і за пэўную ўзнагароду аддавалі іх у рэкруты. Адначасова, калі ў заможных бацькоў нараджаліся хлопчыкі, іх увогуле не запісвалі ў метрычныя кнігі ці прыпісвалі да бедных сем'яў. На службу, зразумела, ішлі дзеці беднякоў.

На падлог пайшоў і адзін з капыльскіх варацілаў кагала Мойша Бройд, калі ў яго нарадзіўся сын Шолам-Якаў. Так у Капылі з'явіўся не Шолам-Якаў Бройд, а Шолам-Якаў Абрамовіч. Пазней, калі ён стаў знакамітым пісьменнікам Мендэле Мойхер-Сфорымам, што ў перакладзе на беларускую мову азначае Мендэле-кніганоша, прызнаваўся: “У нашай сям'і ўсталявалася думка аб тым, што я нарадзіўся ў канцы 1835 года”. Аднак у энцыклапедычных даведніках называецца больш дакладная дата — 20 снежня, а калі па новым стылі, дык 2 студзеня 1836 года.

Да 14 гадоў Шолам-Якаў жыў больш-менш бесклапотна, але, як бывае часта, прыйшла, калі яе менш за ўсё чакаеш, бяда. Нечакана захварэў і памёр у 41 год бацька. На сямейнай радзе параіліся і накіравалі Шолам-Якава да багатых сваякоў у Цімкавічы. Толькі ён у іх доўга не затрымаўся, уцёк да маці. Тая ж адправіла яго на вучобу ў Слуцк, дзе знаходзіўся адзін з буйнейшых на Беларусі ешыботаў — чарговая па ступені рэлігійная школа пасля хедэра. Пра атмасферу, што панавала там, можна даведацца з аповесці Мендэле Мойхер-Сфорыма “Шлёма, Хаймаў сын”, што з'яўляецца свайго роду мастацкай біяграфіяй аўтара: “Хлопцы, якія мелі хлеб ці грошы, гандлявалі, а тыя, хто не меў ні хлеба, ні грошай, займаліся крадзяжом, сядзелі і расказвалі адзін аднаму жудасныя гісторыі: пра разбойнікаў і волатаў, пра чараўнікоў і чарцей, што з'яўляюцца ўначы на полі і зводзяць людзей, пра мерцвякоў, якія пакідаюць свае магілы, блукаюць навокал і лечаць хворых людзей палявымі травамі ці мучаюць грэшнікаў...”.

Шолам-Якаў, пры жаданні, мог бы нблага ўладкаваць свой лёс. На яго звярнуў увагу слуцкі рэб Ейна. Нават хацеў ажаніць яго на сваёй дачцэ-перастарцы. Але ў час заручын адбыўся прыкры выпадак. Хлопец няўдала падчапіў відэльцам курыную нагу, тая паляцела і трапіла ў вока будучага цесця. Засталося Шоламу-Якаву назаўсёды развітацца з Ейнам. І са Слуцкам таксама, бо ў сценах ешыбота яму даўно стала невыносна цяжка.

Пайшоў Шолам-Якаў па свеце. Ажно ў Вільню трапіў, пажыў у багатага сваяка, крыху павучыўся ў мясцовым ешыбоце, але захацелася дамоў. А маці якраз чарговы раз выйшла замуж за багатага арандатара млына з хутара Мельнікі, што непадалёк ад Капыля. Той згадзіўся, каб пасынак стаў хатнім настаўнікам яго дзяцей. Праца Шоламу-Якаву спадабалася, ды і маляўнічыя мясціны былі вакол хутара. Вабіла да сябе вялікая рака. Там, дзе стаяў млын, вада з шумам і грукатам спадала зверху, круцячы колы. Усё гэта выклікала ў душы юнака надзіва лірычны, узнёслы настрой. Пачаў заўважаць, што ўсё часцей хочацца схіліцца над аркушам паперы, каб выказаць тое, што не давала спакою.

Пачаў перапісваць тэксты песень, якія пачуў ад знаёмага Іцкі-шаўца. А пасля... Узяўся за напісанне п'есы. Пісаў, здзіўляючыся, як новае захапленне авалодвае ўсёй істотай. Не менш здзіўляўся і таму, што пасля гэтай працы больш спакойна і ўсцешна станавілася на душы. Быццам палёгку атрымліваў ад паўсядзённых трывог, ад жыццёвай неўладкаванасці. Якніяк, а час бег, узрост пад дваццаць набліжаўся. А ніякага сталага прытулку ды і занятку пакуль не займеў. Іншы б на яго месцы нейкую работу падшукаў бы ў Капылі. Але ад думкі, што трэба назаўсёды застацца ў мястэчку, няхай і родным, але з аднастайным жыццём, не радавала.

Душы хацелася прастору, перамены абставін. А калі такая ўзнёсласць парываў, дык не вельмі думаецца пра вынікі непрадуманых рашэнняў. Так і сталася, калі выпадкова пазнаёміўся з нейкім кульгавым Аўрамелем. Падаўся разам з ім на Валынь. І — “трапіў у нерат: ні ўзад, ні ўперад”. Мала таго, што Аўрамель аказаўся звычайным земляком, дык яшчэ прымушаў у дарозе і Шолама-Якава прасіць міласціну.

Думаў, што лягчэй стане ў Камянец-Падольску: там жыў яго даўні сябар, які быў родам з мястэчка Грозава, што таксама на Капыльшчыне. Але сябар некуды выехаў. Зусім было рукі апусціў. З Камянец-Падольска падаўся куды вочы глядзяць. Ды трэба ж — на дарозе сустрэў сябра, які ехаў насустрач у вазку з бесклапотнымі юнакамі. Той запрасіў яго да сябе, а пасля пазнаёміў з вядомым мясцовым дзеячам, настаўнікам, знаўцам Бібліі Аўрамам-Бэрам Гатлоберам. Яно і вызначыла далейшы шлях Шолама-Якава. Дзякуючы гэтаму чалавеку юнак пачаў вывучаць рускую і нямецкую мовы, па-сапраўднаму зацікавіўся сусветнай літаратурай. Узяўся за напісанне трактатаў, у якіх узнімаў надзённыя праблемы выхавання, асуджаў талмудысцкую адукацыю, выкрываючы ў ёй дагматызм, схаластычнасць.

У 1857 годзе дэбютаваў на старонках газеты “Гамагід” з артыкулам “Ліст па пытаннях выхавання”. Гэта было першае штотыднёвае выданне, разлічанае на яўрэйскага чытача, якое выходзіла ў мястэчку Лік у Прусіі. У перакладзе на беларускую мову гучыць як “Прапаведнік”.

На гэты час Шолам-Якаў паспяхова здаў экзамены ў так званае казённае вучылішча і атрымаў права займацца педагагічнай дзейнасцю. Першая публікацыя рэзка змяніла яго жыццёвы накірунак. Вырашыў цалкам прысвяціць сябе публіцыстыцы. Пераехаў у Бярдзічаў, дзе пісаў шмат артыкулаў, розныя трактаты. У 1860 годзе выйшла яго кніга “Мірны суд”, у якой малады аўтар палемізаваў з вядомым тады педагогам і пісьменнікам, аўтарытэтам у яўрэйскім асяроддзі Л.Цфейфелем. Не згаджаўся з яго спробай адшукаць кампраміс паміж хасідызмам і асветай. Рабіў гэта тактоўна, аргументавана. Новы публіцыст адразу звярнуў на сябе ўвагу.

Здавалася, пасля ўдалага дэбюту поспех публікацый наканаваны. Атрымалася наадварот — першы раман “Бацькі і дзеці” не атрымаўся. Безумоўна, у многім сказалася творчая нявопытнасць аўтара. І ўсё ж, бадай, асноўная прычына была ў іншым. Раман з'явіўся на старажытнаяўрэйскай мове — іўрыце, якой просты народ не ведаў, а размаўляў на ідыш. Мендэле Мойхер-Сфорыму нічога не заставалася, як свае творы пісаць на гэтай мове. Разумеў, што падобным учынкам узніме “супраць сябе так званую грамадскую думку”. Разумеў, аднак, і іншае: “Усведамленне карысці майго ўчынку ўзяло нарэшце верх над пачуццём памылковага сораму, і я сказаў сабе: няхай будзе тое, што будзе! Я буду змагацца ў першых шэрагах за гэты самы жаргон і буду ім служыць майму народу!”

Словы не разышліся са справай. У 1864—1865 гадах у пецярбургскім штотыднёвіку “Колмевассэр”, што ў перакладзе азначае “Голас апавяшчаючы”, быў апублікаваны першы твор Мендэле Мойхер-Сфорыма на ідыш “Маленькі чалавечак”. З гэтага моманту, па сутнасці, і нарадзіўся пісьменнік, які стаў пачынальнікам новай яўрэйскай літаратуры. Пазней другі класік яе Шолам-Алейхем назаве Мендэле Мойхер-Сфорыма яе дзядулем.

Так і з'явіўся на літаратурнай арэне “Мендэле-кніганоша”. З'явіўся, каб сказаць праўду пра яўрэйскі народ. Тую праўду, якую дагэтуль замоўчвалі. Пабудаваная ў форме маналога самага “маленькага чалавечка” багача Іцхока-Аўрэмла, аповесць надзіва псіхалагічна глыбока раскрыла саму душу яўрэйскага народа. Аўтар пра гэта прама сказаў у самым пачатку твора, укладваючы ў вусны галоўнага героя, тое, што думаў сам: “...я ж таксама яўрэй, у мяне таксама, як кажуць, жывая душа, і ёй таксама хочацца да ўсяго прыслухацца, прынюхацца, як і кожнай яўрэйскай душы. Гэта ж часта прыносіць карысць”.

Аднак і аповесць “Маленькі чалавечак”, і п'еса “Такса, ці Банда дабрадзеяў горада”, апублікаваная ў 1869 годзе, выклікалі да аўтара нянавісць з боку таўстасумаў. Калі ў “Маленькім чалавечку” Мендэле Мойхер-Сфорым толькі пачаў раскрывацца як сатырык, дык у “Таксе...” ён дасягнуў надзвычайнага поспеху ў выкрыцці тых, хто паразітаваў на сваім народзе. Давялося, уцякаючы ад праследаваццеляў, развітацца з Бярдзічавам і пераехаць у Жытомір.

Не пісаць ён ужо проста не мог. У 1873 годзе з'явілася аповесць “Кляча”. Гэты твор, як, бадай, ніводзін іншы ў Мендэле Мойхер-Сфорыма, алегарычны. Малады чалавек Ісролік, які ўваходзіць у таварыства “Абарона жывёл”, знайшоў неяк ледзь жывую каняку, пачаў выходжваць яе, а тая раптоўна загаварыла чалавечым голасам. Па просьбе Ісроліка каняка расказала пра сваё жыццё, у якім адны здзекі, пакуты, панавалі несправядлівасць, голад, холад. Гісторыя жывёлы, але хіба за яе лёсам не паўставаў лёс такіх жа абяздоленых, забітых і забытых людзей?

Ад твора да твора расло майстэрства пісьменніка, усё новымі гранямі раскрывалася яго сатырычная манера. Гэта была сатыра, што вырасла з самой рэчаіснасці, з паўсядзённага яўрэйскага жыцця. Сімпатычнае прызнанне аўтара ў прадмове да рамана “Фішка Кульгавы” (прататыпам у пэўнай ступені стаў той самы кульгавы Аўрамель): “Я пастаянна нашуся з жабракамі, беднякамі, абяздоленымі. Перад маімі вачыма пастаянна носіцца торба, спаконвечная яўрэйская торба. Куды б я ні павярнуўся, усюды мне мроіцца торба; пра што я ні задумаў расказаць, мне прыгадваецца торба”.

Інакш кажучы, у цэнтры ўвагі Мендэле Мойхер-Сфорыма нязменна знаходзіўся лёс абяздоленых і пакрыўджаных, і гэтых людзей ён рабіў у асноўным героямі сваіх твораў. Як таго ж Фішку Кульгавага. Мала бяды, што ад нараджэння была, дык і новая з'явілася. Жонка Фішкі, дарэчы, таксама інвалід, сляпая. А тут узяла і здрадзіла мужу. Але Фішка мужна перанёс чарговае выпрабаванне лёсу. Да ўсяго знайшоў такую ж пакрыўджаную душу: у яго закахалася гарбатая дзяўчына.

Сусветную вядомасць Мендэле Мойхер-Сфорыму прынесла аповесць “Падарожжа Веніяміна Трэцяга”. Спачатку ў 1895 годзе яна была перакладзена на польскую мову, а затым пад назвай “Яўрэйскі Дон Кіхот” выйшла на рускай і чэшскай. Веніямін Трэці, як і яго іспанскі папярэднік, — дзівак. Падобныя дон-кіхоты, якія заўсёды гатовы змагацца за справядлівасць, нярэдка трапляюць у камічныя сітуацыі. Вось і Веніямін са сваім паплечнікам Седзеламбаба (чым не Санча Панса!) вырашыў шукаць дзесяць старажытнаяўрэйскіх плямён, якія, паводле легенды, зніклі і пражываюць недзе за гарамі Цемры. Аб папулярнасці аповесці гаворыць і тое, што яна была інсцэніравана і пастаўлена ў многіх тэатрах Еўропы. На сцэне ж Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра ў Маскве ролю галоўнага героя нязменна выконваў славуты С.Міхоэлс.

Калі паставіць побач “Маленькага чалавечка”, Фішку Кульгавага" і, нарэшце, “Падарожжа Веніяміна Трэцяга”, атрымаецца свайго роду трылогія. І звяном гэтага “ланцуга” стануць назвы населеных пунктаў, адкуль родам галоўныя героі. Дарэчы, ці не першым на гэта звярнуў увагу Шолам-Алейхем:" ...тры сталіцы... фігуруюць ва ўсіх тварэннях Мендэля Мойхер-Сфорыма і самімі назвамі дакладна пазначаюць усю сутнасць тагачаснага яўрэйскага гета... Глупск — невуцтва. Кабцанск — галеча, Туняядаўка — беднякі без рамяства, без працы, без занятку, лішнія істоты на свеце".

У 1881 годзе Мендэле Мойхер-Сфорым назаўсёды застаўся ў Адэсе. Займаўся не толькі творчай працай (у 1889 годзе былі надрукаваны першыя часткі рамана “Запаветнае кальцо”, у 1899-м — аповесць “Шлёма, Хаймаў сын”), а і педагагічнай дзейнасцю. У прыватнасці, узначаліў яўрэйскую школу.

Да апошняга свайго дня (памёр у глыбокай старасці 8 снежня 1917 года) Мендэле Мойхер-Сфорым спазнаваў жыццё свайго народа, каб данесці да ўсяго чалавецтва праўду пра яўрэяў. І за гэта нашчадкі ўдзячныя яму.

Міхась ЯНОВІЧ.

Пра Мендэля Мойхер-Сфорыма можна прачытаць:

У.Фінкель. Мендэле Мойхер-Сфорым. Мн., 1940.

Краткая литературная энциклопедия. Т.4.М.,1967.

Беларуская энцыклапедыя. Т.10.Мн.,2000.

Затрыманы за распаўсюджванне газет

Старшыня Віцебскай арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) Алена Залеская, а таксама актывісты АГП Марына Арцімовіч, Святлана Ламанюк, Тамара Аркушава і Андрэй Талстых былі затрыманы міліцыяй на пешаходнай частцы Прывакзальнай плошчы ў Віцебску. Міліцыя ўгледзела парушэнне грамадскага парадку ў распаўсюджванні імі спецыяльных выпускаў грамадска-палітычных газет “Рабочы” і “Беларуская маладзёжная”, прысвечаных выбарам прэзідэнта. Падазрэнне выклікалі і аднолькавыя майкі з надпісам “Надакучыў!”.

Даставіўшы затрыманых у Чыгуначны РАУС, ахоўнікі грамадскага парадку канфіскавалі частку газет. Прыкладна праз гадзіну, не склаўшы ніякага пратакола, затрыманых адпусцілі.

Паводле слоў Алены Залескай, шматлюдная Прывакзальная плошча — удачнае месца для хуткага распаўсюджвання прэсы. За пяць хвілін да затрымання партыйныя актывісты паспелі раздаць прахожым некалькі сотень экзэмпляраў газет.

Леанід СІМАНАЎ.

ИНТИМ

“Раздень меня до самого скелета...”

Из опыта сексуально-эротической прозы

Несовершеннолетним читать не рекомендуется



...Давно заметил: просыпаюсь в субботу или воскресенье — почти сразу же попадаю в мир под условным названием “ПРО ЭТО...”. Ну, про “ТО”, о чем еще раньше рассказывала нам по НТВ небезызвестная темнокожая красавица Елена Ханга. Чья суперэмансипированность, раскрепощенность и раскомплексованность однажды довела коммунистов российской Госдумы до того, что они уже было собрались ее линчевать...

Дочка с внуком, убедившись, что я уже не сплю, тут же врубают “ящик”, где по РТР в программе “Доброе утро, страна!” уже вовсю витийствуют Лола с Сашей. Это они, являясь раньше, до развода, по совместительству участниками дуэта “Академия”, познакомили нас со своим знаменитым “шлягером”:

Ты отказала мне два раза...
“Не хочу!”, — сказала ты.
Вот такая вот зараза —
Девушка моей мечты...

Юморной, со взаимными подначками диалог то и дело перебивается вокально-музыкальными видеоклипами, где тема “ПРО ЭТО” превалирует и доминирует, где всевозможные “Стрелки”, “Блестящие”, “Отпетые мошенники”, “Моральные кодексы”, “Мумий Троли”, “Секторы Газа”, “Руки вверх!”, “Дискотеки ”Авария” вкупе с такими же озабоченными “ЭТИМ” солистами и солистками (исключительно российскими!) вводят нас в такой “интим”, от которого наши дедушки с бабушками сегодня сгорели бы со стыда:

Ты сегодня взрослее стала,
И учебу ты прогуляла.
Я приду — меня ты зацелуешь,
Поцелуев мне твоих, ох, мало.
Я хочу, чтоб ты сказала:
“Целуй меня везде —
Восемнадцать мне уже...”

Здесь нет и строчки, от которой хотя бы чуть-чуть пахло поэзией. Но для “попсы” такая “материя” просто неподъемна: ей нужно попроще. Чтоб сразу на поток, на конвейер. Одно слово — шоу-бизнес. Главное, чтобы присутствовало “ЭТО”.

Получив такую вот “телезарядку”, еду в центр Минска по делам. В подземном переходе возле ГУМа — красочные афиши с анонсами: к нам едет из Москвы — непрерываемым потоком на ловлю зрителя — почти вся эстрадно-попсовая рать! И всех мы радостно, взахлеб привечаем, устраиваем им аншлаги в Минске и на периферии, рекламу даем сногсшибательную по БТ, предлагаем лучшие гостиницы и шикарнейшие концертные залы (а между тем Съезд белорусов мира еле втиснули в тесный душный зальчик, где даже президиуму негде было сесть).

О чем же поют нам эти, с позволения сказать, “звезды”? Одни, считай, “тру-ля-ля” да “гоп со смыком”. Оголенные пупки, “специфические” раскачивания и игра бедрами... “Круто!”

В творчестве многих приезжих артистов вы почти не найдете песен о девичьей чистоте, о настоящей любви. (О родине пел Игорь Тальков, но его убили.) Зато в шлягерах, хитах московской, извините, “попсярни” с лихвой “ЭТОГО”. То бишь — откровенного секса, слегка, но чаще грубо и неудачно замалеванного иносказанием. Раньше, при Советах, говорили: “У нас секса нет!”. Теперь же “ЭТО” из ТВ, радио, госгазет, журналов, выступлений всевозможных куплетистов-юмористов, видео- и аудиокассет, по Интернету прет так, будто где-то рядом прорвало канализацию! Особенно с концертно-эстрадных подмостков, в том числе и на “Славянском базаре”. Вот откровенничает вроде бы пристойный, скромный Валерий Сюткин (группа “Браво!”): “Дай мне только шанс, дай мне только ночь, — и ты не уснешь, когда я рядом...” Ему вторит вроде бы серьезный и патриотичный Олег Газманов: “А я девушек люблю! Я их вместе соберу, вдоль по линии прибор за собою уведу...” Куда? Понятно, не на выставку малоизвестных эскизов Микеланджело и не на концерт “Виртуозов Москвы”.

И действительно: чего тут тянуть, волынить и кочевряжиться? Живем же во времени высоких темпов и головокружительных скоростей. Взять в руки “Камасутру”, как берет прораб на стройке чертежи, уединиться (а можно и не) — и вперед, к познанию вершин телесных наслаждений, меняя “позы”, “схемы” и “ракурсы” чуть не приклодно... Одна эстрадная российская знаменитость откровенничает перед публикой: “С тобой одной хочу, тебя хочу...” Вот “хочет” парень — и все тут. И кричит, вопит об этом на весь белый свет! Кажется, приведи к нему такую же сексапильно-озабоченную самку — устроят любовь, на миру такое “занятие любовью”, что похлеще показанных по РТР “Основного инстинкта” или “Греческой смоковницы”. И поблекнут перед этим “Лука Мудищев” Баркова и “Гавриилиада” Пушкина, Леда в объятиях Лебедя и Даная под золотым дождем Юпитера, легкие непристойности “Кентерберийских рассказов” и фривольности “Декамерона”.

Казалось бы, парадокс, но в деле музыкально-песенного опошления высоких чувств и образа женщины (словно она резиновая кукла из секс-шопа для удовлетворения соответствующих потребностей “сильного пола”) почему-то особенно рьяно выступают... сами дамы. Тут признанный “классик”, по-моему, Ирина Аллегрова, чьи “афоризмы” давно вошли в женский фольклор: “Все мы, бабы — стервы! Милый мой, постой: кто у нас не первый, тот у нас второй!” Аллегрова наступает на пятки суперсексуальной Маше Распутиной, которая, кстати говоря, вовсе и не Распутина, и не Маша, а Алла Агеева. После ее бесстыдных песенных излияний хочется сказать: уж лучше бы ты, Маня, уехала в свои Гималаи! Известно, насколько “свободно” одевается (или, скорее, раздевается) на сцене Распутина, лишь символически прикрывая свои интимные места. Однажды прямо во время концертного выступления, где она то и дело выразительно нагибалась и показывала свои соблазнительные ягодицы, у нее вдруг... лопнули трусики. Зал минут десять ревел от восторга. Скорее, это была “домашняя заготовка”... В плане демонстрации “высокой славянской духовности”, надо думать.

На песенной эстраде, которая с помощью нескончаемых вояжей российских “шоу-звезд” давно превратилась в крикливый эротико-сексуальный балаган с алчным, циничным, запредельно безнравственным “шоу-бизнесом”, ЖЕНЩИНА, МАДОННА представлена пустышкой, размалеванной куклой, развращенным существом, удел которого — удовлетворять настежь расхристанную мужскую плоть. Эта разнузданная порнуха-чернуха, которую и в самой России, и в странах Закавказья, Прибалтике уже давно никто не ждет (“наелись!”), в Беларуси почему-то вольготно гуляет и выпендривается — повторяю — в лучших залах Минска и других городов страны. Низкопробные, извините, “попсяры” и “попсярухи”, титулованные “сатирики”, у которых “ЭТО” тоже является как бы доминантой, навязчивой идеей-фикс, встречают у нас помпезный прием с подчеркнутой лестью и благоговейным придыханием. Их ролики беспрестанно крутятся по телевизору, их афишами заполонены все рекламные места и площади. Тут им — настоящий клондайк. На афишной тумбе у станции метро “Немига” прочитал: “Самый смешной комик российской современной эстрады — в самом веселом шоу ”ОБАЛДЕТЬ!” А потом я слышал такую вот “репризу” этого смехача-хохмача: “Папа едет в Ленинград — мамин хахаль будет рад! Мамин хахаль — наш сосед, мама купит мне мопед!”

Зачем нам, скажите на милость, такой вот “хоккей”?! Мутный, зловонный, заразный поток глубоко безнравственной вакханалии льется на головы взрослых и, что особенно страшно, детей из радиодинамиков в концертах по заявкам, в поездах, на базарах, школьных дискотеках, в гостиницах, барах, ресторанах и кафе, офисах...

Женское тело, женская красота, целомудрие, чистота, девственность стали товаром. В фильмах по ТВ, и не только американских, как и в романах российских “творцов” Тополя, Незнанского, Лимонова, Марининой и других то и дело читаешь: “трахаться”, “заниматься любовью”, “переспать”, “педрило”, “голубой” и т.д. (уверяю, я привожу лишь самые “невинные” слова). А ведь место этих словечек лишь в спецсправочниках по сексопатологии.

Известная российская феминистка Мария Арбатова просвещает публику: “Первый возлюбленный научил меня варить хороший кофе и еще тому... что тридцатилетний мужчина может спать с пятнадцатилетней девочкой, не отягощая ее даже ликбезом о противозачаточных средствах. И мы [illegible] оказались в постели под аккомпанемент программы “Время”...”

Было бы глупо предъявлять М.Арбатовой претензии с точки зрения христианской (да и не только христианской!) морали. Она, оказывается, ходит к психоаналитику, который освобождает ее от “омерзевших комплексов”, и полагает, что всякого рода табу (запреты) лишают, видите ли, человека свободы... Оригинальное понимание свободы, нечего не скажешь.

Вспоминаю одну из вечеринок, где “оттягивалась”, можно сказать, элитарная публика: артисты, журналисты, юристы, поэты, “настоящие полковники”. Был даже депутат горсовета... Разогревшись водочкой, устроили “концерт художественной самодеятельности”, где в качестве приза (для мужчин) была довольно экзотическая для всех молоденькая “леди”, томный недвусмысленный взгляд которой, казалось, мог оживить даже мертвеца. К тому же она оказалась... начинающей поэтессой, стихи которой шли “на бис”: “Живу я без табу и без запретов, приду к тебе — ты только позови. Раздень меня до самого скелета и в топке страсти огненной сожги!” Слушая ЭТО не без смущения, я вспомнил деревянную беседку ботанического сада. На ней по резному фронтону толстым фломастером начертано: “Я жду твоей любви. Скорей мне позвони! Вика”. И телефончик. Не та ли “поэтесса” ЭТО написала?

Наша моральная глухота и терпимость к подобной “сексухе-порнухе” вовсе не безобидна. Когда женщина остается без тайны, это уже неинтересно. Свобода в виде полуобнаженной женщины звала когда-то на баррикады. С тех пор ее раздели донага и сделали подстилкой. Не потому ли у нас молодые, красивые, умные, самодостаточные женщины чаще всего ходят в “старых девах”. Не потому ли у нас почти каждый второй брак распадается, растет ранняя импотенция мужчин, а в семьях лишь по одному ребенку? (В этом плане кажется просто нелепой назойливая реклама на БТ “фотовыставки” обложек журнала “Плейбой”.)

***

...Возвращаюсь из центра города домой. У подъезда на лавочке хихикают подростки. До моих ушей доносится анекдот: “Один мужик в магазине спрашивает продавщицу: “У вас есть трусы?” — “Нет”. — “А в продаже?” Взрыв детского смеха... Слово берет другой рассказчик: “А вот про Чапаева. Слыхали...” Разговор продолжает девочка лет двенадцати: “Приходит мужик к сексопатологу...” Далее не смею цитировать услышанное от почти ребенка.

В результате такой вот “сексуальной революции” мы имеем то, что имеем. У нас уже восьмиклассницы в сумках вместе с сигаретами носят на занятия в школу контрацептивы. А в армию скоро призывать будет некого...

Александр ОЛЬХОВОЙ.



ЗДАРЭННІ

Пацярпелі двое інжынераў

Два чалавекі пацярпелі ў выніку выбуху сумесі параў вадароду і кіслароду, які адбыўся на рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве “Брэсцкі электралямпавы завод”.

Інжынеры-дэфектаскапісты унітарнага прадпрыемства “Дыякод” праводзілі праверку рэзервуараў, прызначаных для захавання газаў пад напружаннем, на прадмет магчымасці іх далейшай эксплуатацыі. Калі ў адным з такіх рэзервуараў быў адчынены люк, туды спусціўся інжынер, а яго напарнік вырашыў пасвяціць калегу запальніцай. Пары вадароду, якія вырваліся вонкі, ад рэакцыі з кіслародам узгарэліся. У выніку інжынер, які карыстаўся запальніцай, атрымаў сур’ёзныя апёкі лёгкіх і 60-ці працэнтаў цела. Яго напарнік атрымаў нязначныя апёкі і будзе лячыцца амбулаторна.

Шпіталізаваны з атручэннем

83 падлеткі з летняга лагера адпачынку “Вербы” Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці шпіталізаваны з дыягназам “харчовая токсікаінфекцыя”. Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе Упраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях па Брэсцкай вобласці, мяркуецца, што 12—13-гадовыя школьнікі атруціліся садавінай.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

БЕЗ ВЕСТИ ПРОПАВШИЙ



Партизанским РУВД г.Минска разыскивается без вести пропавший несовершеннолетний гражданин Зданчук Александр Валерьевич, 26.12.1986 г.р., уроженец г.Минска, проживающий: г.Минск, ул.Багратиона, 71—59, который 23.07.2001 года около 14 часов дня вышел из дому и до настоящего времени его местонахождение неизвестно.

ЕГО ПРИМЕТЫ: на вид 14 лет, рост 170 см, средней полноты, лицо овальное, брови дугообразные, глаза серо-голубые, нос прямой, рот средний, подбородок вертикальный, уши овальные, волосы прямые, темно-русые, короткая стрижка, голос звонкий, речь ясная.

ОСОБЫЕ ПРИМЕТЫ: над правой бровью вертикальный шрам от пореза, длиной около 20 см.

БЫЛ ОДЕТ: шорты сине-белого цвета с лампасами, майка темно-серого цвета, кроссовки импортные с красными вставками.

Просим граждан, знающих что-либо о местонахождении или судьбе без вести пропавшего, позвонить по тел.: 230-67-25, 230-34-34, 230-44-40, 230-10-12 либо по телефону 02.

В.КРАСНИЧЕНКО, начальник Партизанского РУВД г.Минска, подполковник милиции.

СПОРТ

“Славія” выбывае з Лігі чэмпіёнаў

Мазырская “Славія” згуляла паўторны паядынак другога кваліфікацыйнага раунда розыгрышу Лігі чэмпіёнаў супраць браціслаўскага “Інтэра”. Нагадаем, першы матч гэтых каманд, што праходзіў у Мазыры, завяршыўся мінімальнай перамогай славацкіх футбалістаў — 1:0. На жаль, у Браціславе беларускія футбалісты не здолелі ўзяць рэванш. “Інтэр” быў мацней за “Славію” і зноў 1:0. Гол на 72-й хвіліне правёў Аліас Лембакалі. Такім чынам, выступленне беларускага чэмпіёна ў Лізе чэмпіёнаў скончылася.

Але хутка на старт у кубку УЕФА выйдуць яшчэ тры беларускія каманды. Барысаўскі БАТЭ згуляе з тбіліскім “Дынама”, салігорскі “Шахцёр” з балгарскім ЦСКА, а бабруйская “Белшына” са славенскім “Ружэнберокам”.

Беларускія артысты возьмуць удзел у чэмпіянаце свету па футболе

З 23 жніўня па 1 верасня ў Маскве адбудзецца першы чэмпіянат свету па футболе сярод каманд артыстаў эстрады і кіно “Арт-Футбол”.

На старт першынства выйдуць каманды з 16 краін свету. Беларускія артысты на першым этапе трапілі ў групу А разам з камандамі Аргенціны, Чэхіі і Швецыі. Чакаецца, што ў складзе каманд згуляюць Элтан Джон, Род Сцюарт, Хуліо Іглесіас, Сцінг, Жэрар Дзепардзье і інш. Сярод зорак футбола на поле выйдуць такія майстры як Дыега Марадона, Зіка. За кожную каманду дазволена заяўляць двух ветэранаў, чый узрост не менш за сорак гадоў. Дакладна вядома, што за беларускую каманду згуляе Іван Жэкю. Другая “ветэранская” кандыдатура пакуль што ўдакладняецца.

У планах ФІФА стварэнне сусветнай футбольнай лігі для артыстаў эстрады і кіно. Яна будзе фарміравацца па выніках выступлення каманд на будучым чэмпіянаце. Беларуская каманда, якая мае назву “Арт-Старз” была створана ў 1996 годзе. У розны час у складзе “зорнай” каманды гулялі Сяргей Кузін, Уладзімір Станкевіч і інш. Падрыхтоўку да першага сусветнага першынства беларуская каманда праводзіць пад кіраўніцтвам гуляючага трэнера Зміцера Давуша на футбольным полі спецназа, што па вуліцы Маякоўскага. З дапамогай трэнера футбольнай зборнай Беларусі Эдуарда Малафеева і начальніка галоўнай каманды краіны Леаніда Гарая каманда “зорак” атрымала два камплекты футбольнай формы.

Зразумела, што артысты не толькі будуць гуляць у футбол, але і спяваць. Кожная краіна-ўдзельніца чэмпіянату свету дасць канцэрт, на якім пакажа ўласную творчасць. Свой канцэрт беларусы дадуць першымі — 23 жніўня ў 18 гадзін. А 1 верасня на маскоўскім стадыёне “Лужнікі”, які ўмяшчае 85 тыс. гледачоў, адбудзецца вялікі гала-канцэрт. Беларусь на ім будуць прадстаўляць Ядзвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч.



Ядзвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч.

Фота IREX/ProMedia.

Дарэчы, беларускі бок падаў заяўку ў сусветную Кнігу рэкордаў Гінэса. Мяркуецца, што беларускі асілак Вячаслаў Харанэка, на рахунку якога не адзін дзесятак гучных рэкордаў, усталюе яшчэ адзін рэкорд. На працягу дванаццаці гадзін наш зямляк будзе ўздымаць піўны кег вагой сорак кілаграмаў. Ранейшае падобнае дасягненне належыць самому Харанэку. За 12 гадзін ён уздымаў саракакілаграмовы груз 2000 разоў.

Усе сродкі ад продажу квіткоў на эстрадна-спартыўны форум з дапамогай дабрачыннага фонду “Дзеці вуліц” будуць накіраваны на вырашэнне праблем падлеткавай наркаманіі.

Застаецца дадаць, што знаёмства з беларускай зорнай камандай адбудзецца 10 жніўня.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ХОЧАЦЕ — ВЕРЦЕ, ХОЧАЦЕ — НЕ ВЕРЦЕ

Будучы тыдзень: зоркі прадказваюць

АВЕН. Тыдзень абяцае немалыя поспехі ў справах і фінансах. Асабліва гэта датычыцца першай яе паловы, калі перад вамі адкрыецца шмат магчымасцяў.

ЦЯЛЕЦ. Час да серады лепш прысвяціць роздумам, а не дзеянням. Сярэдзіна тыдня азначае пачатак вашага новага жыццёвага цыкла. Вас чакае неверагодны прыліў энергіі, жыццялюбства, абаяльнасці. З мінусаў — схільнасць да празмерных трат на ўласныя задавальненні.

БЛІЗНЯТЫ. Час быць экстравагантнымі, адкрывацца насустрач свету. І калі вы маеце намер правесці гэты тыдзень утыкнуўшыся ў паперы ці ў камп’ютэр, — на поспех можаце не разлічваць. Ён прыйдзе да тых з вас, хто будзе мець шмат зносін і на рабоце, і па-за ёй. Пятніца — добры дзень для пачатку рамана.

РАК. Вы будзеце вынаходлівымі і дасціпнымі, і чым больш складаную галаваломку падкінуць вам абставіны, тым з большай ахвотай і поспехам вы будзеце яе вырашаць. У гэтай сувязі ёсць шанц злавіць на сабе не адзін захоплены позірк. А бліжэй да выхадных вашу ўвагу прыцягне нейкая падзея, што адбылася даўно.

ЛЕЎ. Хоць тыдзень і пачнецца не вельмі спрыяльна — магчымы пэўныя замінкі і канфлікты, у вас хопіць мудрасці і цярпення, каб знайсці правільнае рашэнне. Пасля серады прыйдзецца засяродзіцца на фінансавых пытаннях. Вам трэба будзе займацца падаткамі, працэнтамі і іншымі не вельмі цікавымі, але вельмі важнымі рэчамі.

ДЗЕВА. Першая палова тыдня можа быць перагружана звычайнай работай, але потым чакаецца штосьці нечаканае. Дзіўны сон, а то і містычнае здарэнне могуць вымусіць вас па-новаму зірнуць на свет. І шукаць дапамогі спецыялістаў у такіх пытаннях.

ШАЛІ. Увесь тыдзень вы будзеце атрымліваць задавальненне ад кампаній. Нават не важна, ці гэта сяброўская вечарына, ці размовы з калегамі ў курылцы. Проста так вам будзе больш камфортна. Што датычыцца спраў, дык вельмі спрыяльная серада, калі вы зможаце дасягнуць вялікіх поспехаў і завяршыць даўно пачатыя праекты.

СКАРПІЁН. Увесь тыдзень вы будзеце схільны апераджаць падзеі. Вас і на самай справе наведаюць выдатныя ідэі, а пачатыя справы прывядуць да поспеху. Але ідэі дадуць плён не зараз, а пазней. Проста скажыце сабе, што вы працуеце на будучыню, і не чакайце імгненных вынікаў.

СТРАЛЕЦ. Нават калі вы і раней не маглі паскардзіцца на кепскую сітуацыю на працы, дык зараз усё стане яшчэ лепш. Творчасць і ініцыятыва будуць у вялікім фаворы. А значыць, і вы таксама. Магчыма, у вас нават з’явіцца мудры і велікадушны кіраўнік-заступнік.

КАЗЯРОГ. Вельмі паспяховы тыдзень. Калі вы, напрыклад, цудоўна працуеце, дык маеце ўсе шанцы быць адзначаным, ухваленым і павышаным на службе. А калі ўсё наадварот, дык і ўсе шанцы на адваротнае. Выбірайце. Акрамя таго, шмат цікавага і прыемнага абяцаюць знаёмствы з новымі людзьмі.

ВАДАЛЕЙ. Да чацвярга ўсё будзе працякаць як звычайна. А вось затым вельмі верагодны сур’ёзныя перамены, якія закрануць і вашу працу, і ваш статус, і рэпутацыю, і кола зносін. Не бойцеся мяняцца, калі адчуеце, што ўжо прыйшоў час. І тады высвеліцца, што перамены толькі да лепшага.

РЫБЫ. Тыдзень нічым асаблівым не вызначыцца. У сярэдзіне яго можа здарыцца канфлікт з афіцыйнымі ўстановамі. Будзьце вельмі ўважлівымі! І хаця вы павінны перамагчы, нерваў змарнуеце шмат.

У пятніцу магчыма вечарынка, але будзьце асцярожнымі з моцнымі напоямі, інакш усю суботу будзеце пакутаваць ад дрэннага стану здароўя.

Пятница, 3 августа

БТ

06.30, 07.10 Доброе утро, Беларусь!
07.00, 09.00, 11.00, 13.00, 15.00 Новости.
07.55, 17.05 **“Морская полиция”**. Сериал.
08.40 Письменный экзамен по белорусскому (русскому) языку и литературе в средние специальные учебные заведения.
09.10 **“Маленькие Эйнштейны”**. Сериал.
09.35 “Время местное”. Репортажи из провинции.
10.05 Док. сериал “Города мира”. Фильм **“Гавана”** (США).
10.30 “Великие женщины века”. Принцесса Диана (США—Англия).
11.15 **“Человек моря”**. Сериал (Аргентина).
12.00 “Славянский базар в Витебске-2001”. Международный конкурс детских коллективов.
13.15 Комедия **“В старых ритмах”**.
14.40 Док.сериал “Сокровища мировой культуры” (Германия).
15.15 “Маленькие изобретения”. Мультсериал.
15.20 “Мой любимый зверь”. Док.сериал.
15.30 “Все на орбиту!” Познавательный сериал.
15.40 **“Маленькие Эйнштейны”**. Сериал.
16.10 Сериал **“Кавингтон Кросс”**.
18.00, 23.25 Новости.
18.25 Зона Икс.
18.35 Мир и мы.
19.00 Худ.фильм **“Репетитор”**.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама. Информационный канал.
22.00 **“Человек моря”**. Сериал (Аргентина).
22.50 Спорт-курьер.
23.00 “Встреча в Троицком” с А. Домарацким.

ОРТ

08.00 Новости.
08.15 **“Земля любви”**. Сериал.
09.15 **“Противостояние”**. Сериал.
10.15 “Сами с усами”.
10.50 “Библиомания”.
11.00 Новости.
15.45 “Ералаш”.
16.00 **“Собачье дело”**. Сериал.
17.00 Новости.
17.20 “По следу "своих". Дело 2001 года”. Документальный детектив.
17.50 **“Земля любви”** (Бразилия, 1999). Сериал.
18.50 “Поле чудес”.
20.00 “Время”.
20.40 Комедия **“Достопочтенный джентльмен”**.
22.45 Новости.
23.00 Детектив **“Слово полицейского”**.

РТР

08.00, 10.00, 16.00, 19.00 “Вести”.
08.15 “Два рояля”.
09.00 “Моя семья”.
10.30 **“Санта-Барбара”**. Сериал.
16.30 “Сам себе режиссер”.
17.00 **“С новым счастьем!”** Сериал.
18.00 **“Любовь.ru”**. Сериал.
19.30 “Вести-Москва”.
19.50 Драма **“Осторожно! Красная ртуть!”**.
21.30 **“Номер "люкс" для генерала с девочкой”** (1991). Художественный фильм.
23.35 Драма **“Седьмое знамение”**.

КУЛЬТУРА

07.05 “Новости культуры”.
07.20 “После новостей...”.
07.40 Авантюрный кинороман **“Афера Цеплиса”**.
09.15 “Песни Юрия Чичкова”.
09.40 **“Вихрь цветов”**. Сериал.
11.30 “Новости культуры”.
11.40 “Павел Филонов в воспоминаниях современников”. Документальный фильм.
13.00 Сергей Рахманинов. “Вариации на тему Шопена”. Исполняет Н.Луганский.
13.30 “Новости культуры”.
13.45 Мультфильмы.
14.30 “Кто мы?” “Реформы по-русски”.
15.00 Новости.
15.10 **“Энн из поместья "Зеленые крыши"**. Сериал.
15.40 “Век Русского музея”.
16.05 “Сенсация! Сенсация? Сенсация...”.
16.35 **“Вихрь цветов”**. Сериал.
17.30 “Новости культуры”.
17.40 Документальные фильмы.
18.30 “В вашем доме”.
19.10 “Вечерняя сказка”.
19.20 “Веселая карусель”. Мультфильм.
19.30 “Новости культуры”.
19.50 **“И огонь, и пламя”**. Сериал.
21.05 “Завещание XX века”. “Папа Хэмингуэй”. Часть 2-я.
21.50 **“Боже, испепели Танблидж Уэллс!”** (Великобритания) Худ. фильм. 2-я серия.
23.00 “Новости культуры”.

НТВ

05.00, 06.00, 07.00 Сегодня утром. Информационная программа.
05.15, 06.15, 07.15 Спорт, погода.
05.20, 06.25, 07.20, 18.35 Криминал.
05.30, 06.35, 07.25, 14.45 Впрок.
05.40, 06.45, 07.40 Карданный вал.
05.45 Мультфильм.
07.50 Сериал **“Поющие в терновнике”**.
09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
09.25 Сериал **“Трое”**.
10.25 Путешествия натуралиста.
11.30 Сериал **“Вечный зов”**.
13.30 Старый телевизор.
15.30 “Улица Сезам”.
15.55 Сериал **“Ее звали Никита”**.
17.00 Геннадий Хазанов. “Жил был я...”
19.05 Фильм **“Каскадеры”**.
21.50 “Женский взгляд”.
22.35 Фильм ужасов **“Дом-3”**.
00.30 Сериал **“Голод”**.

TV-6

05.00, 06.00 День за днем.
05.45, 19.45, 21.40, 00.25 **Дорожный патруль.**
08.00 Новости.
08.20 Тушите свет.
08.35 Фильм **“Старинный водевиль”**.
10.00 Мини-сериал **“Достойное ремесло”**.
11.10 Вестерн **“Перестрелка”**.
13.00 Сериал **“Полицейские во времени”**.
14.00, 18.00, 20.00, 22.00 “Сегодня”.
14.30 “Я знаю все!”.
16.20 Сериал **“Третья планета от Солнца”**.
16.50 Сериал **“Возвращение Шерлока Холмса”**.
18.35 Сериал **“Агент национальной безопасности-II”**.
20.40 Ток-шоу “Я сама”.
22.40 Эродетектив **“Отель страсти”**.

СТВ+RenTV

06.00 “Симба-футболист”. Мультсериал.
06.30, 16.30 “Кот по имени Ик”. Мультсериал.
07.00 “Симпсоны”. Мультсериал.
07.30 “Музыка на СТВ.
07.45 “Случайный свидетель”.
08.05 “Свет и тень”.
08.30 Новости СНГ.
08.45 Мелодрама **“Кумпарсита”**.
10.35 “Виртуальный мир”.
10.45 “Дискавери” на СТВ.
11.05, 23.20 Комедия **“Самый короткий день”**.
13.30 Новости СТВ.
13.45 **“Пляж”**. Сериал.
14.45 **“День рождения Буржуя”**. Сериал.
16.00 “Дьяволик”. Мультсериал.
17.00 **“Дракоша и компания”**. Сериал.
17.30 Новости СТВ.
17.45 “Виртуальный мир”.
18.00 “Раузан”. Теленовелла.
19.00 “Случайный свидетель”.
19.30 Новости “СТВ-24 часа”.
19.45 Минск на перекрестке столетий.
20.00 **“Мэш”**. Сериал.
20.30 Программа “Тема дня”.
20.45 “Вечарніца”.
21.00 Боевик **“Один против якудза”**.
23.05 Новости СНГ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04.
E-mail : nv@irex.minsk.by
http://nv.promedia.minsk.by
Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб’явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ПП “Мэджык”. Адрас: г. Мінск, вул. Кнорына, 50. Падпісаны ў друк у 15.00. Фармат А-2. Тыраж: 42600 экз., Заказ № 610.